## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | Изолированное помещение, инв. № 422/D-28190 (назначение – торговое помещение, наименование – торговое помещение № 1), площадью 1487,4 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, г.п. Острино, ул. Гродненская, 7-1 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 425856600002000051, площадью 0,2531 га (назначение – для обслуживания здания магазина «Универмаг») по адресу: Щучинский р-н, г.п. Острино, ул. Гродненская, 7. Земельный участок выделен под капитальное строение, оформление пользования земельным участком будет производиться в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь |
| **Начальная цена продажи** | 98 900 (девяносто восемь тысяч девятьсот рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 4 945 р. (четыре тысячи девятьсот сорок пять рублей) |
| **Продавец** | Щучинский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231513, г. Щучин, ул. Пушкина, 26 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | Аукцион без условий |
| **Условия оплаты** | Рассрочка платежа за приобретаемое имущество сроком 5 лет, с уплатой первоначального взноса до подписания договора купли-продажи в размере 20% от договорной стоимости, с погашением оставшейся суммы ежемесячно равными долями не позднее 30 числа месяца начиная с месяца, следующего после заключения договора купли-продажи |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области БИК 153001739 УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 12 мая 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Щучин, ул. Пушкина, 26**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:**
**г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209,**
**с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), с 8.30 до 16.30 (пятница)**
**Последний день приема заявлений – 4 мая 2017 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
**http://grodnoino.by/**



## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**извещает о проведении открытого аукциона по продаже транспортных средств, принадлежащих ГИПК «ГАЗ-ИНСТИТУТ» на праве оперативного управления**

| № Лота | Описание | Начальная цена с учетом НДС 20%, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот №1 | Автогидроподъемник ПМС-328 на базе шасси MAZ 5337 A2 340PMS 328D кузов (рама) №Y39PMC328B2008128/ Y3M5337A2B0003806, 2011 г. в. Цвет – серый. Грузоподъемность люльки – не более 250 кг. Рабочая высота подъема – 28-0,3 м. Вылет (м. не более) – 13,8 | 19 926,72 | 996,34 |
| Лот №2 | Экскаватор ЭО 2621 В-2 (на базе трактора «Беларусь» ЮМЗ 6кл). Заводской №146193, 1988 г. в. Заводской №573272. Двигатель: Д-65М №8Б2181. Емкость штатного ковша – 0,25 куб. м. Вылет стрелы при наибольшей высоте подъема – 2,3 м | 3 584,58 | 179,23 |
| Лот №3 | Автокран КС 4572 на базе КамАЗ 53213 кузов (рама) №ХТС532130К0021116/532130021116. Тип ТС – грузовой специальный кран. 1989 г. в. Разрешенная масса – 16 000 кг. Цвет – темно-зеленый. Грузоподъемность максимальная – 16 т. Длина стрелы – 9,7….21,7 м. | 3 327,01 | 166,35 |

**Местонахождение лотов –**
Гомельская обл., г. Гомель, пер. Ильича 8-й, д. 30

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи Объекта (Объектов).
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 25.05.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

**Продавец**: ГИПК «ГАЗ-ИНСТИТУТ» 220038, г. Минск, 1-й Твердый переулок, д. 8, комн. 405, т.(017) 294-65-11

**Организатор аукциона**: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 8 (017) 306-00-57

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже транспортных средств, принадлежащих ГИПК «ГАЗ-ИНСТИТУТ», проводимом 25 мая 2017 г.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. **Окончание приема заявлений** 23.05.2017 в 11.00. Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактное лицо для осмотра Объектов – Матвеенко Александр Васильевич, 8044 780 64 97.

Организатор аукциона имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до наступления даты его проведения

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**


■ Руплівым гаспадарам

# Пашпарт для бульбы




**Ці ведалі вы, што ў бульбы ёсць пашпарт? Прычым інфармацыі ў ім на некалькі старонак — пра паходжанне сорту, яго ўстойлівасць да хвароб і экстрэмальных умоў, тэхналогіі вырошчвання і захоўвання і нават «кулінарныя» ўласцівасці.**

Каб вывесці новы сорт бульбы, вучоным трэба 11—12 гадоў! Са ста тысяч сеянцаў селекцыянер адбірае адну расліну, з якой пачынае працаваць. Прычым падыходзіць да яе «нашчадкаў» даволі жорстка, вельмі шмат выбракоўваецца на кожным этапе. Раслінам давядзецца прайсці не адно выпрабаванне як у лабараторных, так і ў палявых умовах. Іх нават штучна будуць затопліваць і ствараць засуху, заражаць хваробамі. Вучоныя сочаць, як расліны пачуваюць сябе на розных глебах і ў розных рэгіёнах, правяраюць, як клубні пераносяць механізаваную ўборку. Карацей, стварэнне новага сорту — вялікая і складаная праца, да якой на ўсіх этапах падключаюцца спецыялісты розных лабараторый. У Інстытута бульбаводства Акадэміі навук поле для дзейнасці больш за 150 гектараў — гэта плошчы, на якіх вядзецца селекцыйная, насенняводчая работа, і адпрацоўваюцца тэхналагічныя пытанні, звязаныя са стварэннем агратэхнічных пашпартоў для новых сартоў бульбы. Ёсць і плёначныя цяпліцы, занятыя пад стварэнне новых гатункаў «другога хлеба». Бульба нават вырошчваецца праз прабірку.



— Гэта неад'емнае звяно ў вырошчванні бульбы, — тлумачыць **загадчык лабараторыі тэхналогій вытворчасці і захоўвання бульбы Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па бульбаводстве і плодаагародніцтве Дзмітрый ФІЦУРА**. — Праз прабірку пасадачны матэрыял атрымліваецца чысты, без інфекцый — найперш без віруснай, што вельмі важна ў пачатку насенняводства, бо ў далейшым гэта можа адбівацца на ўраджаі і якасцях новага сорту.

***— Якія хваробы людзі набываюць з няякасным насеннем?***

— На першым месцы — вірусныя. У Расіі фіксаваліся завозы разам з насенным і харчовым таварам каранцінных хвароб, такіх як кальцавая, бурая гніль. У нас былі выпадкі завозу бульбы з паражэннем серабрыстай паршой — яна праяўляецца ў перыяд захоўвання, прычым плямы на сухіх клубнях можна і не заўважыць.

***— Як не атрымаць сур'ёзную праблему, бо хваробы могуць «кватараваць» у зямлі не адзін год?***

— Я раіў бы агароднікам набываць насенне ў правераных вытворцаў. Напрыклад, можна звяртацца на абласныя доследныя вопытныя станцыі, у спецыялізаваныя буйныя гаспадаркі, а таксама ў наш інстытут у Самахвалавічах.

Калі расліна слабаразвітая, прыгнечаная, у яе можа быць некалькі хвароб адначасова. Прымета дзеяння вірусаў — маршчыністасць, скручванне, мазаіка лісця, нехарактэрнае лісце і бацвінне для сорту. Дарэчы, такім чынам расліна можа «заяўляць» і пра недахопы харчавання, пэўных элементаў. Але хваробы могуць быць не толькі на насенні, у глебе, але і дадавацца пры вырошчванні. Напрыклад, тлі пераносяць вірусную інфекцыю.

***— Якая самая частая памылка агароднікаў?***

— Памылкі розныя, напрыклад, вельмі ранняя пасадка. Саджаць бульбу можна, калі глеба прагрэлася на глыбіню 7—8 см. Аптымальныя тэрміны пасадкі для цэнтральнай часткі краіны — трэцяя дэкада красавіка — першая дэкада мая, у паўднёвай — 2-3-я дэкада красавіка. У першую дэкаду красавіка можна паспрабаваць пасадзіць бульбу толькі, калі ёсць мэта атрымаць раннюю прадукцыю. І тое ёсць рызыка вяртання халадоў. Калі пасадзіць бульбу вельмі рана, расткі могуць пашкоджвацца рызактаніёзам — усходы будуць зрэджаныя. У цёплае надвор'е гэта хвароба можа і не праявіцца. Перад пасадкай бульбу абавязкова трэба прагрэць і прарасціць. Калі яна пазелянеўшая, гэта добры задзел для атрымання дружных і здаровых усходаў.

***— Ці трэба яе надразаць на 5—8 міліметраў?***

— Аматары могуць паэксперыментаваць — так яны дадуць імпульс для прабуджэння ўсіх вочак на бульбіне. Важна пасля гэтага насенне падсушыць, каб рана зарубцавалася. Але ўсё ж я б не рэкамендаваў яе рэзаць, каб не занесці інфекцыю. А яшчэ насенне добра апрацаваць рэгулятарамі росту, мікраўгнаеннямі, асартымент такіх прэпаратаў даволі вялікі. Можна згадаць экасіл, паліком-бульба, камплімет-бульба, нанаплант і іншыя. А можна дзейнічаць прасцей: узяць агульнадаступныя прэпараты — борную кіслату, медны купарвас і марганцоўку. Гэта і абеззаражванне пасадачнага матэрыялу, і стымул для росту і развіцця бульбы. Пажадана праводзіць апрацоўкі раслін мікраэлементамі, мікраўгнаеннямі пачынаючы з фазы, калі бацвінне крыху сфарміравалася (вышыня — 20 см), далей — у пачатак бутанізацыі. Можна сумяшчаць падкормкі з фунгіцыднымі апрацоўкамі, толькі пры гэтым праверыць прэпараты на сумяшчальнасць. Калі расліна атрымлівае добрае харчаванне, яна моцная, нават дзеянне вірусаў будзе нівеліравана.

***— А як атрымаць ураджай без «хіміі»?***

— Мы праводзілі даследаванні па арганічнай тэхналогіі вырошчвання бульбы. Так, біялагічныя прэпараты бясшкодныя, але іх трэба прымяняць часцей, чым хімічныя. Такія ёсць і супраць шкоднікаў, у тым ліку каларадскага жука (бітаксібацылін, бацытурын, ксантрэл), фітафтарозу і альтанарыёза (ксантрэл, бактофіт, фітаспарын-М).

***— Ці рэальна вырасціць бульбу без фітафторы?***

— Трэба аддаваць перавагу ў вырошчванні бульбы ўстойлівым да гэтай хваробы сартам. Есць шэраг такіх, напрыклад, сярод ранніх — «Лілея», сярэдняпозніх і позніх: «Атлант», крахмалістыя сарты «Здабытак», «Рагнеда», «Акцэнт». Ёсць сарты, устойлівыя да паршы: «Скарб», «Брыз», «Журавінка», «Вектар». Важна прытрымлівацца севазвароту і выкарыстоўваць біялагічныя прэпараты. Заўважу, што ў сувязі з пацяпленнем клімату ўсё больш нарастае праблема з альтэрнарыёзам. Фітафтароз вы распазнаяце па мучністым налёце, альтэрнарыя — гэта канцэнтрычныя плямы карычневага колеру на лісце. Альтэрнарыёз асабліва праяўляецца ў спякотныя, сухія гады — плямкі могуць з'явіцца нават у чэрвені. Прэпаратаў ад гэтай хваробы недастаткова. Часта яны малаэфектыўныя, бо з'яўляюцца новыя штамы, устойлівыя да іх.

***— Спалучэнне бульбы з бабовымі можа быць прафілактыкай хвароб і нашэсця шкоднікаў?***

— У прыватным сектары сапраўды можна выкарыстоўваць падбор культур, і не толькі бабовыя, але і мяту, кроп. Старыя спосабы працягваюць працаваць. Напрыклад, агароднікі абараняюць свае грады тымі ж адварамі цыбулі, часнаку, крапівы, хвашчу, сасны, палыну. Але куды прасцей карыстацца біяпрэпаратамі.

***— Што трэба ведаць пра глыбіню пасадкі і акучванне?***

— Глыбіня пасадкі на лёгкіх глебах да 10 см, а на суглінках — да 8. Высокае акучванне вельмі важнае. Пры фарміраванні высокай градкі вакол куста да 22—25 см ствараюцца добрыя ўмовы для атрымання таварнага ўраджаю. А яшчэ мы выратоўваем ўраджай бульбы ад пазелянення. Акрамя таго, лічыцца, што паражэнне клубняў фітафтарозам зніжаецца ў 2—5 разоў.

***— На што трэба звярнуць увагу пры выбары сорту?***

— У айчынным рэестры зараз 147 гатункаў, 48 — беларускай селекцыі (на гэты год зарэгістравалі ў дзяржрэестры сярэдняранні — «Палац» і сярэдняпозні — «Лель»). Кожны сорт мае свайго спажыўца, бо некаму трэба, каб бульба развaрвалася, іншым — наадварот. Можна выбіраць з улікам формы і колеру лупіны і мякаці. Пажадана мець некалькі сартоў розных груп спеласці — гэта аснова для стабільнага атрымання ўраджаю, бо расліны па-рознаму рэагуюць на глебы, надвор'е, стрэсавыя ўмовы. Так, летась, здавалася, раннія сарты павінны быць больш ураджайнымі, але познія таксама далі добры ўраджай. Можна звяртаць увагу на ўмовы захоўвання: ёсць сарты з працяглым перыядам спакою, а ёсць тыя, што могуць рана «прачынацца». Можна раіць многія сарты — «Зорачка», «Уладар», «Маніфест», «Крыніца», «Волат», «Лад», «Журавінка», цяпер па плошчах на першае месца выходзіць «Брыз». Адзін з новых высокаўраджайных сартоў — «Вектар» — устойлівы да засухі. «Маг» — адзін з найлепшых сартоў для перапрацоўкі на чыпсы.

***— Ураджайнасць дасягаецца ў многім за кошт таго, што сарты ўстойлівыя да хвароб?***

— Гэта адзін з важкіх фактараў. Яшчэ важна, як расліна рэагуе на ўгнаенні, плюс патэнцыяльныя магчымасці сорту, якія закладзены генетычна. Мы рэкамендуем праз 4—5 гадоў абнаўляць пасадачны матэрыял, бо некаторыя сарты з цягам часу губляюць свае ўласцівасці. Так, у першыя гады яны даюць добрыя ўраджаі, а пасля ўраджайнасць можа рэзка зніжацца. Але ёсць і такія гатункі, якія доўга стабільна сябе праяўляюць, — напрыклад, «Скарб».

***— Ці быць нашай бульбе ў «Макдональдсах»?***

— Тут трэба пэўная біяхімія бульбы, ёсць патрабаванні па сухім рэчыве, рэдуцыруючых цукрах, устойлівасці да пацямнення. У нас такія сарты ёсць, і трэба больш перапрацоўваць на бульбапрадукты. Неабходна развіваць свае брэнды — тыя ж дранікі. Дарэчы, у інстытута ёсць лабараторыя, дзе якраз вывучаецца прыдатнасць будучых сартоў да перапрацоўкі, на якія бульбапрадукты яны падыходзяць, у тым ліку фры, дранікі, і апошні кірунак — для вакуумавання, што цяпер запатрабавана.

***— Ці ёсць сарты для дыетычнага харчавання?***

— Мы працуем і ў гэтым кірунку. Многа дыскусій: якія павінны быць паказальнікі ў такога прадукту. Між іншым, у бульбе, акрамя крухмалу, ёсць якасны бялок, вялікае ўтрыманне калію, вітаміну С. За мяжой праводзіліся даследаванні, якія паказалі, што на бульбяной дыеце можна нават скідаць вагу.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*